Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ, тэл. 287 18 27. № 24 (482)

КАБ БЫЦЬ З ЯГАДАМІ

У канцы лета ў ягадных кустоў фарміруюцца пладовыя пупышкі — аснова будучага ўраджаю. У гэты час ім асабліва патрэбна ваша дапамога.

Не забывайце паліваць і рыхліць глебу, знішчаць пустазелле, берагчы расліны ад шкоднікаў і хвароб. Пасля збору ўраджаю можна ўжываць хімічныя сродкі абароны.

Агрэст

Супраць плямістасці лісця і амерыканскай мучністай расы апырсквайце 3-працэнтнай бардоскай вадкасцю, а супраць шкоднікаў — «Інта-Вірам», «Іскрай залатой», «Актарай», «Фуфанонам», «Актэлікам» (на выбар). Калі вы праціўнік хіміі, выкарыстоўвайце біялагічныя сродкі абароны: «Бітаксібацылін», «Ляпідацыд» ці «Дэндрабацылін».

А наймілейшая справа — настоі і адвары раслін. Толькі не забывайцеся дадаваць у іх мыла для лепшай ліпкасці. Ад ліставога пільшчыка, агрэставага пядзеніка, тлі, кляшча дапамагаюць настоі і адвары палыну горкага, бацвіння таматаў і бульбы, крываўніку, тытуню і махоркі. Каб пазбавіцца ад мучністай расы,

выкарыстоўвайце настой каравяку: 1 частку каровінага гною заліце 3 часткамі вады, вытрымайце 3—4 дні, працадзіце і развядзіце вадой 1:3. Гэтым настоем апырсквайце ўвечар кусты — так, каб ён трапляў і на ніжні бок лісця. Праз тыдзень апрацоўку паўтарыце.

Маліна

Як толькі скончыце збор ягад, адразу ж выражце парасткі, якія адпладаносілі як мага ніжэй, не пакідаючы пянькоў. Гэта трэба для таго, каб не было скупнасці сухіх галінак, якія замінаюць з'яўленню маладых сцёблаў. Выражце таксама слабыя, паламаныя парасткі і ўкараціце на 10—15 см усе здаровыя парасткі, якія вы пакідаеце для ўраджаю будучага года. Аптымальная норма: 8—12 парасткаў на 1 пагонны метр. Усе выразаныя парасткі, калі яны пашкоджаны грыбнымі хваробамі, адразу ж прыбярыце з участка і спаліце, а маліннік апрацуйце ад хвароб і шкоднікаў. Здаровыя сцёблы можна выкарыстоўваць для абвязкі ствалоў дрэў на зіму. Глебу, ушчыльненую за час збору ягад, праматычце, знішчаючы пустазеллі і параснік у міжраддзях.

І ў завяршэнне правядзіце апырсканне малінніку ад хвароб і шкоднікаў. Пры антракнозе, белай плямістасці (сэптарыёзе), іржы, язвавай плямістасці сцёблаў маліны — 1-працэнтнай бардоскай вадкасцю.

З малінава-сунічным даўганосікам, павуцінным кляшчом, тлёй змагаюцца пасля збору ягад растворам карбафосу (60 г на 10 л воды), а з парасткавай галіцай ці малінавым камарыкам — больш слабым яго растворам (30 г на 10 л). Супраць малінавага жука, сцёблавай мухі і молі ўжываюць прэпараты «Іскра», «Дэціс», «Канфідор».

ПЫТАЛІСЯ — АДКАЗВАЕМ

Мох на дрэве

Што рабіць, калі пладовыя дрэвы ў старым садзе запар пакрыты мохам і лішайнікамі?

Правядзіце апырсканне 3-працэнтным растворам жалезнага купарвасу па голых шкілетных галінах (рабіць гэта трэба ў яшчэ адносна цёплыя лістападаўскія дні). А затым пабяліце штамбы або 20-працэнтным вапнавым малаком з дадаваннем 1-працэнтнага раствору меднага купарвасу, або гатовай пабелкай для пладовых дрэў.

Не забывайцеся: мох і лішайнікі моцна аслабляюць дрэвы і даюць дарогу для паразітаў — грыбоў. Губы, разрастаючыся грыбніцай у глыб драўніны, забіваюць любы сад павольна, але дакладна.

Васіль ЕМЯЛЬЯНАЎ.

г. Расоны.

З-за чаго «закучаравілася» морква?

Лісце моркві счарнела і закруцілася. Чым гэта можна растлумачыць і, галоўнае, што рабіць?

Марына Пахвалькова.

г. Пінск

Калі на лісці з'яўляюцца бурыя плямы, лісце закручваецца і набывае выгляд «абвараных», значыць, морква захварэла на бурую плямістасць лісця. Пры гэтым пашкоджваюцца яшчэ і караняплоды, на якіх з'яўляюцца невялікія плямы светла-карычневага колеру, якія пакрываюцца затым шэрым налётам.

Захоўваюцца яны дрэнна, таму адразу пускайце іх на перапрацоўку ў агароднінныя кансервы.

Калі такая хвароба на моркве назіраецца ўпершыню, то яе прычына — у заражаным насенні, на якім грыб можа захоўвацца да трох гадоў. Часам крыніцай інфекцыі з'яўляюцца і раслінныя рэшткі.

Хворую моркву трэба выкапаць і выдаліць раслінныя рэшткі. А на наступны год гэтую культуру варта пасадзіць ужо ў іншым месцы.

Склаў Яўген ЛЯХАЎ.



Адказы на скаванорд +суДоку
Па гарызанталі: Ахазнік. Сулекка. «Ружа». Адпаз. Тон. Горо. Аднан. Пчыкур. Куб. Пугра. Ата. Дамбра. Апрон.»Гарэж». Лаг. Аарс. Рэдкі. Тэка. Самен. Лат. Лама. Мерцыцын. Гарэнчык.
Па вертыкалі: Кроль. Мурог. Хаюо. Гібартар. Пчаго. Пародал. Кавга Уроа. Варана. Лн. Строн. Кванцлік. Анал. Казуга. Ар. Мдаран. Брана. Радам. Жбір. Акына.
СуДоку: адказы гл. у тэлічыі.

3	5	2	1	4	8	9	7	6
7	4	6	9	5	3	2	1	8
1	9	8	6	7	2	5	4	3
2	1	9	8	6	5	7	3	4
4	3	7	2	1	9	8	6	5
8	6	5	7	3	4	1	2	9
6	2	4	5	9	1	3	8	7
9	8	3	4	2	7	6	5	1
5	7	1	3	8	6	4	9	2

				4	8		7	
								8
1					2	5		
	1	9	8				3	4
4		7		1		8		5
8	6				4	1	2	
		4	5					7
9								
	7		3	8				

СУДОКУ. *У квадраце 9×9 клетак размясціце лічбы ад 1 да 9 уключна такім чынам, каб у кожным радку, кожным слупку, у блоках 3×3 клеткі, абмежаваных тлустай лініяй, кожная лічба сустракалася толькі адзін раз, без паўтораў.*

ДЫВАН... З СУНІЦ

ШТО ДАЮЦЬ ПАСАДКІ ПАВЫШАНАЙ ШЧЫЛЬНАСЦІ?

Суніцы — адна з самых цудоўных культур на ўчастку! Можна вырошчваць іх асобнымі кустамі, высаджваючы расліны на досыць вялікай адлегласці (45—60 см) адна ад адной і выдаляючы ўсе вусы, якія ўтвараюцца. У гэтым выпадку кожны куст дае максімальны ўраджай, але і хутчэй высільваецца, патрабуе замены.

А можна дазволіць вусам расці і неўзабаве сфарміраваць паласу з разетак, якія ўкаранелі. За кошт большай колькасці новых раслін ураджай можа быць такім жа, як пры кустовай сістэме і нават вышэй. А самае галоўнае — такую плантацыю можна трымаць на адным месцы без замены значна даўжэй.

Можна нават стварыць з раслін дыван.

Што ўяўляюць сабою дывановыя пасадкі, якія іх добрыя якасці і недахопы?

У першую чаргу, гэта сістэма, пры якой усе вусы і разеткі, якія ўтвараюцца, атрымліваюць магчымасць укараняцца ў межах адведзенай плошчы. Дзякуючы вольнаму ўкараненню разетак ужо праз год пасля пасадкі шчыльнасць дасягае 30—50 раслін на 1 кв. м.

Гэта забяспечвае першы ўраджай да 2,0—2,5 кг з 1 кв. м, а ў далейшым — да 3,5 кг. Калі ёсць магчымасць, можна пасадзіць расліны адразу шчыльна, 30 х 30 см. Пры гэтым, як заўсёды для суніц, важна добра падрыхтаваць глебу, разрыхліць яе і вызваліць ад шматгадовага пустазелля.

Пры такім размяшчэнні расліны даюць добрую лістоту, якая не дазваляе актыўна развівацца пустазеллю. У выніку на працягу вегетацыі спатрэбіцца замест пяці-шасці ручных прапалак не больш за дзве-тры. Шчыльны ліставы полаг засцерагае расліны і ад пашкоджанняў падчас першых маразоў.

Тэрмін пасадкі суніц можа быць любым, але лепшы час — позняе лета ці ранняя восень. Тады расліны паспеюць развіцца і запоўніць усю адведзеную ім плошчу да зімы. Сакрэт добрай прыжывальнасці раслін пасля пасадкі — у старанным паліванні на працягу чатырох-пяці дзён.

У першы і другі гады пасля пасадкі варта ўстрымацца ад скошвання лісця ўвосень пасля збору ўраджаю, каб маладыя разеткі мелі магчымасць укараняцца аж да восеньскіх маразоў.

Важна таксама правільна выбраць гатунак. І тут лепш кіравацца не назвамі гатункаў, а іх якасцямі. Найбольш прыстасаваны для пасадак з павышанай шчыльнасцю гатункі, расліны якіх да канца першай вегетацыі здольныя павялічыць колькасць укараненых разетак не менш чым у 4—5 разоў.

Гатунак павінен валодаць здольнасцю даваць паўнавартасны ўраджай на разетках, якія ўкаранелі ўвосень папярэдняга года, і мець не менш за 80—100 кветканосаў на 1 кв. м. Прычым гэтыя кветканосы павінны быць цвёрдымі. Гатунак таксама павінен быць устойлівым як да гнілі каранёў, так і да гнілі пладоў.

Плантацыі дывановага тыпу значна больш даўгавечныя. Вядомы такі факт: 15—20-гадовыя пасадкі даюць ураджай 150 кг суніц са 100 кв. м.

Дарэчы, можа, і для суніц справядлівая вядомая англійская прымаўка пра газоны, калі толькі першыя гады цяжка, а потым лёгка? Паспрабуйце!

НА ГОМЕЛЬШЧЫНЕ Ў ЛЕС ХАДЗІЦЬ НЕЛЬГА

З-за вострай пажаранебяспечнай сітуацыі забарона на наведванне лясоў уведзена ў Светлагорскім, Лельчыцкім, Чачэрскім, Жлобінскім, Брагінскім і Хойніцкім раёнах Гомельскай вобласці. Пра гэта паведамілі БЕЛТА ў аддзеле аховы і абароны лесу Гомельскага дзяржаўнага лесагаспадарчага аб'яднання.

Падставай для ўвядзення забароны стала сухое і гарачае надвор'е. У вышэйназваных рэгіёнах паказчык пажаранебяспекі пераадолеў чацвёрты клас небяспекі. Такая ж напружаная пажаранебяспечная сітуацыя складваецца і ў Гомельскім раёне. Тут клас небяспекі наблізіўся да максімальнага — пятага. Цяпер рыхтуюцца дакументы на ўвядзенне забароны для наведвання і гэтых лясных масіваў. Пры ўмове захавання такога надвор'я забарона будзе распаўсюджана на ўсю вобласць.

ААТ «Кіруючая кампанія холдынга «Гомельская мяса-малочная кампанія»

сардэчна віншуе **калектыў галоўнага статыстычнага ўпраўлення Гомельскай вобласці** з прафесійным святам — Днём работнікаў дзяржаўнай статыстыкі.

Ваш дружны згуртаваны калектыў — гэта адна каманда, якая, маючы добрую дзелавую рэпутацыю, не толькі пастаянна ўдасканальвае збор, апрацоўку і захоўванне дакладнай статыстычнай інфармацыі, але і прадастаўляе яе органам дзяржаўнага кіравання, што затым выкарыстоўваецца для больш аптымальнай работы ўсіх галін народнагаспадарчага комплексу Гомельшчыны. Вось чаму важнасць работы, якую вы выконваеце, цяжка пераацаніць у сацыяльна-эканамічным развіцці рэгіёна.

Шчыра, ад усёй душы жадаем вашаму калектыву моцнага здароўя, бадзёрасці, асабістага шчасця, далейшых творчых удач у нялёгкай працы, мэтанакіраванасці. Няхай у вашых сем'ях пануюць узаемапавага, каханне, дабрабыт.

Са святам, паважаныя таварышы!

Кіраўніцтва і калектыў ААТ «Кіруючая кампанія холдынга «Гомельская мяса-малочная кампанія».

УНП 490653138

Мне знаёмы казаў біёлаг,
Прамаўляў, каб усе пачулі,
Быццам людзі пайшлі ад пчолак,
Ўсе жылі мы калісьці ў вуллі.

Але нейкі крылаты продак
Закляйміў завядзёнку тую:
— Камуналка — не той асяродак,
Я пентхаус на ўзлеску будую!

А за ім і наступны імкнецца,
Носіць чуткі па наваколлі:
— Ў супермаркеце мёд прадаецца,
Дык навошта рабіць у полі?

Раскалоўся рой назаўсёды,
Але кажуць пра тое людзі:
Не шукайце ў крамах выгодаў.
Хто працуе — той з мёдам будзе.

■ Пытальнік

І даведку, і пасведчанне ветэрынары выдадуць без праблем

Дарагая рэдакцыя! Прашу, каб вы далі мне тлумачэнні. У мяне ёсць парсюк, буду яго забіваць і дзяліць паміж сваімі дзецьмі. Адно з іх жыве ў Мінску, другое — у Лідзе. А як іх у дарозе праверацъ і скажуць, што той парсюк, магчыма, хворы быў? Трэба ж нейкая даведка ад ветурачоў? Дык можа, і не адна, а кожнаму дзіцяці?

Марыя Мікалаеўна Сянько,

с/с Хохлава Маладзечанскага раёна.

Гэтыя пытанні нашай чытачкі мы пераадрасавалі галоўнаму ветурачу Маладзечанскай райветстанцыі Мікалаю Малінцу. Суразмоўца патлумачыў, што зона ў іх — чыстая, прадукцыю ад забою свіней з вясковага падворка можна перавозіць як па самім раёне, так і вывозіць за яго межы. Праўда, паколькі ёсць правілы перавозкі такога кшталту прадуктаў харчавання, у першым выпадку для гэтага спатрэбіцца ветэрынарная даведка, у другім — ветэрынарнае пасведчанне. І даведку, і пасведчанне вяскоўцы без аніякіх праблем могуць атрымаць у райветстанцыі. Адказваючы на пытанне заяўніцы пра колькасць дзяцей, Мікалай Уладзіміравіч падкрэсліў, што патрэбных дакументаў грамадзянам выдадуць столькі, колькі ім спатрэбіцца ■

Паважаныя таварышы!

Адкрытае акцыянернае таварыства «8 Сакавіка» цёпла і сардэчна віншуе **калектыў галоўнага статыстычнага ўпраўлення Гомельскай вобласці** з прафесійным святам — Днём работнікаў дзяржаўнай статыстыкі.

Высокая кваліфікацыя, прафесіяналізм спецыялістаў службы дазваляюць вырашаць важнейшую дзяржаўную задачу па зборы, апрацоўцы, захоўванні статыстычнай інфармацыі. Ваша работа садзейнічае павелічэнню эканамічнага патэнцыялу Гомельшчыны, выкананню намечаных планаў прадпрыемстваў і арганізацый на карысць жыхароў горада.

Ад усёй душы жадаем высокіх паказчыкаў у працы, упэўненасці ў заўтрашнім дні, здароўя, шчасця і дабрабыту вашаму калектыву.

Дырэктар ААТ «8 Сакавіка» Васіль ШЫЦІКАЎ.

УНП 400078265

Шаноўны **Аляксей Рыгоравіч ГОНЧАНКА,**
ветэран Вялікай Айчыннай вайны, старшыня ветэранскай арганізацыі Іўеўскага раёна! Прымі шчырыя віншаванні ў гонар 90-годдзя з дня нараджэння. Жадаю моцнага здароўя, бадзёрасці духу, выдатнага настрою.

Старшыня Савета ветэранаў педагагічнай працы і прафсаюзнай работы Іўеўскага раёна І.С. Жыдзель.

СЁННЯ

Месяц

Поўня 21 жніўня.
Месяц у сузор'і Рыб.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	6.00	20.23	14.23
Віцебск	5.46	20.16	14.30
Магілёў	5.50	20.13	14.23
Гомель	5.51	20.06	14.15
Гродна	6.16	20.38	14.22
Брэст	6.20	20.35	14.15

Імяніны

Пр. *Марыі, Аляксея, Антона, Дзмітрыя, Івана, Мацвея, Пятра, Юльяна, Якава.*
К. *Марыі, Зігфрыда, Цімафея, Цэзара.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА +19..+21°С	КІЕЎ +24..+26°С	РЫГА +16..+18°С
ВІЛЬНЮС +17..+19°С	МАСКВА +20..+22°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ +17..+19°С

УСМІХНЕМСЯ

Нішто так хутка не аздараўляе, як прэйскурант платных клінік.

Адэса, гандаль на зямлі.
— Чаму кавуны лысыя, без палосак?
— Тут канцтавары з фарбамі за рагом, я на іх зніжку зраблю.

Па ацэнках замежных экспертаў, самай удалай распрацоўкай савецкага аўтапрама была ружа на ручцы пераключэння перадач.

Назаўтра пасля выпускнога бацькі зноў знайшлі свайго сына ў капусце.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара—галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 22.974. Індэкс 63850. Зак. № 3619.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 21 жніўня 2013 года.